ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА І МЕНСКАГА КОМІТЭТАЎ ЛЕНІНСКАГА КОМУНІСТЫЧНАГА САЮЗУ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

№ 133 (515) Аўторак, 29 лістапада 1927 г. | Выходзіць тры разы на тыдню у аўторак, чацьвер і суботу | Год выд. VII. | Рэдактар прымае ад 12 да 2 гадз. дню. Сакратар ад 10—12 і ад 2—3 гадз. Тэл. № 903. | Адрас рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена": Менск, Комсам. 25.

Да XV зьезду наша партыя адзіная і згуртаваная

Троцкісцкая опозіцыя разбурвае партыю, разьвязвае антысавецкія, контр-рэволюцыйныя сілы, зрывае дыктатуру пролетарыяту.

Увесь ленінскі комсамол адзінадушна асуджае ганебную працу раскольнікаў.

На правільным шляху.

XI-ты Зьезд КП(б)Б заслухаў даклад т. Кнорына аб дзейнасьці ЦК КП(б)Б за час, прайшоўшы з X-га зьезду.

Увесь шлях, які пройдзен КП(б)Б гаворыць аб тым, што пролетарыят Беларусі, што беларускае працоўнае сялянства можа з сваіх шэрагаў вызначыць патрэбныя сілы для бязупыннага будаўніцтва соцыялізму ў БССР.

Аб гэтым лепш усяго гавораць лічбы, пададзеныя ў дакладзе т. Кнорына: на 1-е студзеня 1927 году рабочых у прамысловасьці ВСНГБ было 27.717, а на першае ліпеня г. г. мы ўжо мелі 28.913 рабочых. Лік членаў профсаюзаў на 1-е студзеня 1927 г. быў 315.792, на 1-ае ліпеня—323.328 ч. Расьце актыўнасьць рабочае клясы. Значна ўзмацнілася праца па організацыі беднаты. Нізавы савецкі апарат галоўным чынам складаецца з бядняцкага і серадняцкага сялянства. Дасягнуты значныя посьпехі ў ажыўленьні дзейнасьці сельскіх і гарадзкіх саветаў. Лёзунг, высунуты X-м зьездам: КП(б)Б на чале культурнага будаўніцтва—усё больш і больш ажыцьцяўляецца.

Гэта дазваляе нам перад надыходзячай ваеннай небясьпекай казаць што партыя цалкам спраўляецца з тымі задачамі, якія перад ёю стаяць. Упартай і напружанай працай партыя стварыла спакойныя ўмовы для нормальнага разьвіцьця нашага далейшага соцыялістычнага будаўніцтра. Пролетарыят і працоўнае сялянства цалкам падрыхтавана да тых перашкод, якія могуць нас сустрэць у зьвязку з магчымымі ваеннымі ўскладненьнямі.

Зьезд таксама сказаў сваё слова па асноўных пытаньнях нашай палітыкі. Задача КП(б)Б, як і УсеКП(б) у далейшым, у асноўным складаецца з таго, каб зноў і зноў працаваць над тым, каб абхопліваць ўсё больш шырокія масы, захопліваюць усё больш адсталыя пласты рабочае клясы і сялянства, выхоўваць у духу міжнароднай солідарнасьці, у духу міжнароднае клясавае барацьбы.

XI-ты зьезд КП(б)Б адзінадушна і аднагалосна зацьвердзіў пастанову па дакладу тав. Кнорына аб дзейнасьці ЦК КП(б)Б за справаздачны час.

У рэзолюцыі адзінаццаты зьезд адзначае, што палітычная і організацыйная лінія ЦК была правільнай.

Рабочая кляса Беларусі таксама ўжо дала ацэнку дзейнасьці нашае партыі і здрадніцкім выступленьням опозіцыі. Больш 2.000 рабочых, якія ўступілі за апошнія тры тыдні ў партыю, ад імя рабочае клясы ўсяе Беларусі кажуць XI-му Ўсебеларускаму Зьезду КП(б), што партыя знаходзіцца на правільным шляху, што яна сапраўды зьяўляецца авангардам пралетарыяту.

XI зьезд КП(б)Б—компартыі Польшчы.

XI зьезд КП(б)Б шле сваё гарачае прывітаньне братняй компартыі Польшчы.

КП(б)Б ідзе да XV зьезду ЎсеКП(б) адзінай, згуртаванай вакол сьцягу Леніна, даўшы рашучы адпор трацкісцкай опозіцыі.

XI зьезд констатаваў пад'ём народнае гаспадаркі БССР, рост і далейшае разьвіцьцё беларускай культуры і культуры іншых нацыянальнасьцяй, што насяляюць нашу рэспубліку і палепшаньне матар'яльнага становішча рабочых і сялян Беларусі.

Гэтыя посьпехі ў соцыялістычным будаўніцтве БССР, як і ўва усім СССР, разьвіваюць нянавісьць сусьветных імпэрыялістых, якія ўсякімі спосабамі і сродкамі рыхтуюць новую контр-рэволюцыйную вайну супроць першай рэспублікі працы.

У гэтай падрыхтоўцы фашысцкая Польшча грае і, бязумоўна, адыграе ролю арудзьдзя вялікіх імпэрыялістычных акул.

Зьезд упэўнен, што компартыя Польшчы зробіць усе крокі для высьвятленьня перад працоўнымі масамі Польшчы авантурыстычных замыслаў польскіх фашыстых і падрыхтуе масы для вялікіх будучых боек за соцыялістычную бацькаўшчыну, за дыктатуру пролетарыяту.

Няхай жыве КПП!
Няхай жыве Комінтэрн!

На зьезьдзе.

○ Дакладвае тав. Галадзед. Што будзе сабою ўяўляць праз пяць год наша гаспадарка? Аб гэтым дакладчык гаворыць языком лічбаў, якi тут-жа, побач, на вельмі добра зробленых дыяграмах, вымалёўваецца калёнамі лічбаў. Вочы слухачоў упіраюцца ў простую, клясную дошку, да якой прымацаваны гэтыя так многа і аб многім гаворачыя дыяграмы.

○ Зьяўленьне на сцэне дэпутата польскага сойму, члена комуністычнай партыі Польшчы тов Сахацкага было спаткана бурнай, доўга нясьціхаючай авацыяй.

○ Чыгуначнікі ў падарунак зьезду паднесьлі вельмі добра тэхнічна выкананую модэль адрамантаванага будынку былшага Віленскага вакзалу.

○ Рабочыя Бабруйскага лесапільнага камбінату зрабілі орыгінальны падарунак—агромністы пень, у сутнасьці прадстаўляючы з сябе шафу, з поўным наборам прадметаў прыгатаўляемых камбінатам.

○ Нягледзячы на тое, што зьезд працуе ужо тыдзень—не спыняецца струмень прывітаньняў. З прывітаньнямі прыходзяць рабочыя ня толькі гораду Менску, але спэцыяльна прыяжджаюць дэлегацыі з усіх куткоў Беларусі.

○ Ня гледзячы на тое, што рабіў прывітаньне „слабы пол"—прадстаўніцы дэлегатак—прывітаньне атрымалася поўнасьцю ваенізаваным. Дэлегацыя з 30 работніц. Частка была у працівагазах, частка была з санітарнымі прыладамі, а некаторыя—з аружжам. У падарунак зьезду дэлегаткі паднесьлі вінтоўку.

○ Фойэ, ці так-званыя „кулуары", скрозь завешаны дыяграмамі і табліцамі, ілюструючымі разьвіцьцё гаспадарчага жыцьця Беларускае Рэспублікі.

○ Усе дэлегаты зьезду атрымалі па біблiотэчцы кніг, у тым ліку вялікі зборнік артыкулаў і прамоў тав. Сталіна па пытаньні аб опозіцыі.

○ Комсамольскія прапаўнікі, якія ўдзельнічаюць у працы зьезду, уключаюцца зьездам ва ўсе організуемыя па дакладам камісіі. Тав. **Бараньнікаў** абраны ў склад камісіі па складаньню рэзолюцыі па дакладу ЦК КП(б)Б, т. **Марчык** па дакладу ЦКК КП(б)Б, т. Шаталіна па дакладу аб 5-цігадовым пляне гаспадаркі і г. д.

○ Апошні нумар газэты „Чырвоная Зьмена" быў разданы ўсім дэлегатам зьезду.

Дзеньнік працы зьезду.

Шосты дзень.

27 лістапада.—Праціг спрэчак па дакладу тав. Калініна.—У спрэчках выказаўся комсамольскі прапаўнік тав. Марчык.—Заключнае слова тав. Калініна.— У перапынку дэлегацыі асобных акруг фотографуюцца.

Вячэрняе пасяджэньне.—Даклад тав. Галадзеда «5-ці гадовы плян гаспадаркі СССР і БССР"—Спрэчкі па дакладу —Тэзісы ў асноўным зьездам зацьвярджаюцца.—Для падрыхтоўкі рэзолюцыі абіраецца камісія з 39 чалавек.—Пасьля пасяджэньня дэлегаты наведалі Белдзяржтэатр, дзе быў пастаўлены спэктакль „Каля тэрасы".

Сёмы дзень.

28-ае лістапада. Даклад тав. Рыжова „Аб працы ў вёсцы".—Спрэчкі па дакладу.—Абраньне камісіі.—На вячэрнім пасяджэньні быў заслуханы даклад тав. Ігнатоўскага „Аб выніках нацыянальна-культурнага будаўніцтва і політыка-асьветнай працы.—Спрэчкі па дакладу.—Абраньне камісіі для выпрацоўкі рэзолюцыі.

Лічбамі і фактамі б'ем опозіцыю.

(Ячэйка ЛКСМБ пры страйкоме 25 РСЧА, МЕНСК).

— Чаму Бухарын выкінуў лёзунг «абагачайцеся?»

— Чаму не апублікоўваюць пляцформу опозіцыі?

— Ці ня лепш замест увядзеньня 7-мігадзіннага працоўнага дню ўзьняць зарплату рабочых, як гэта прапануе опозіцыя?

— Ці праўда, што арыштоўваюць рабочых, (!) якія падтрымліваюць опозіцыю і г. д.

Вось пытаньні, якімі комсамольцы закідалі дакладчыка і якія кажуць, што некаторыя з таварышоў шмат чаго не разумеюць.

Дакладчык цярпліва растлумачвае, што ад свайго лёзунгу «абагачайцеся», які быў выказаны 2 з паловай гады назад, Бухарын адмовіўся не адзін раз, а 20. Ня гледзячы на гэта, опозіцыя пры ўсіх зручных і нязручных выпадках не пакідае опэраваць гэтым лёзунгам супроць большасьці ЦК.

Прысутныя згадзіліся з довадамі, што апублікаваньне ў сучасных умовах пляцформы опозіцыі пагражала-б нам пэўнымі небясьпекамі і дапамагло-б ня нам, а гэтак званай «трэцяй сіле».

— Арышты опозіцыйна-настроеных рабочых—гэта адна з тых шматлікіх «вутак», якія распаўсюджвае опозіцыя ў сваёй барацьбе супроць большасьці партыі. Згубіўшая адказнасьць перад партыяй, опозіцыя ня брэзгуе і такімі сродкамі, як сеяньне раздору паміж УсеКП(б) і рабочай клясай,—зазначыў дакладчык.

Спрэчкі таксама паказалі, што маюцца комсамольцы-адзінкі, якія мала знаёмы з дзейнасьцю опозіцыі і не ўяўляюць сабе небясьпекі, якая вынікае ад розных пляцформаў, контрдэмонстрацый і інш.

У прыватнасьці, тав. Грунтфаст, заявіў, што **«опозіцыя зусім ня ідзе супроць рабочай клясы», ня гледзячы на яе кампанію супроць 7-мігадзіннага рабочага дню. Опозіцыя права, —кажа гэты-ж таварыш,—што матар'яльнае становішча рабочай моладзі пагаршаецца, мы губляем Кастрычнікавыя заваёвы, бо я за мінулы год водпуску не атрымаў».(!)**

Добры адказ даў Грунтфасту тав. **Барысюк**. Пры дапамозе фактаў і лічбаў ён навочна даводзіць, што лямант опозіцыі аб згубе кастрычнікавых заваёў для моладзі зьяўляюцца маною. За апошнія гады перад нашымі вачыма адбываецца няўхільны рост проценту падросткаў у вытворчасьці, паралельна з агульным ростам нашай гаспадаркі.

Выступаўшыя далей адзінадушна **падтрымлівалі лінію ЦК** па пытаньнях, якія агалошаны ў тэзісах. Адзін таварыш нават выказаў зьдзіўленьне з прычыны залішняй мяккасьці партыі ў адносінах да опозіцыянэраў.

— Чаму так доўга няньчыліся з опозіцыяй, трымалі яе ў партыі і давалі магчымасьць весьці раскольніцкую працу? Чаму, нарэшце, ня выключаюць з партыі ўсіх опозіцыянэраў, а абмяжоўваюцца ў дачыненьні некаторых толькі «маральнымі мерамі»?

Рэзолюцыя, прынятая сходам, кажа наступнае:

Заслухаўшы даклад аб пяцігадовым пляне народнай гаспадаркі ў нашай краіне, агульны сход ячэйкі цалкам ухваляе тэзісы ЦК УсеКП(б) па гэтаму пытаньню.

Сход таксама падтрымлівае выключэньне з партыі Троцкага і Зіноўева, якія дайшлі да адкрытага процівадзейніцтва працы партыі па соцыялістычнаму будаўніцтву. У нашых шэрагах не павінна быць месца фракцыянэрам, якія дапамагаюць опозіцыі пахіснуць адзінства ленінскай партыі і ленінскага комсамолу.

Рэзолюцыя прынята аднагалосна пры пяці ўстрымаўшыхся.—Трэба яшчэ пачытаць, глыбэй азнаёміцца з пытаньнямі—казалі тыя, што ўстрымаліся.

Язэп.



Наш адказ опозіцыі.

(Ячэйка ЛКСМБ абойнай фабрыкі, Менск).

У адказ на раскольніцкую дзейнасьць опозіцыі наша ячэйка пасылае лепшых рабочых—комсамольцаў у партыю.

Хто яны?

Шаткін—сакратар комсамольскай ячэйкі. Працуе актыўна ў фабкоме, у рэвізійнай камісіі. Любяць яго комсамольцы—добры таварыш.

Валахненская—работніца. Калі яна працавала ўпаўнаважаным па друку—была 100 проц. падпіска на комсамольскія газэты. Зараз працуе ў коопэрацыйнай камісіі.

Эфрос—член бюро ячэйкі. Доўгі час служыў у Чырвонай арміі. Член фабкому. Добра паказаў сябе на ваеннай працы.

* * *

Рабочай моладзі, якая яшчэ ня ўцягнута ў комсамол, у нас усяго 2 чал., але і яны хутка ўвойдуць у нашы шэрагі.

Так мы адказваем страціўшым свае галовы опозіцыянэрам.

М.

Як Глікмана пасадзілі ў галёшу.

(ЯЧЭЙКА ЛКСМБ, АБОЙНАЙ ФАБРЫКІ, МЕНСК).

Комсамольцы нашай фабрыкі ўвесь час уважліва сачылі за ходам дыскусіі.

Амаль кожны выпісвае „Праўду" і ўважліва прачытвае яе пасьля працы, зьвяртаючы асаблівую ўвагу на тэзісы ЦК і контртэзісы опозіцыі.

З надзвычайнай увагай выслухалі комсамольцы даклад аб пяцігадовым пляне разьвіцьця народнай гаспадаркі на сходзе ячэйкі, прыняўшы актыўны ўдзел у яго абгаварэньні.

З 28 комсамольцаў, якія прысутнічалі на сходзе, выказалася 19 таварышоў.

Выступаючыя адзначылі правільнасьць лініі ЦК, крылі опозіцыю, прыводзячы факты і лічбы росту свайго прадпрыемства.

З сьмехам спаткаў сход словы ячэйкавага опозіцыянэра тав. **Глікмана** (рахункавод фабрыкі). Ён пачаў гаварыць аб тым, што 7-гадзінны рабочы дзень—мана, што гэтым пагоршыцца становішча рабочых.

Яму адразу адказалі:—**Ня вучы, Глікман, нас. Мы—рабочыя лепш за цябе ведаем, што дасьць нам 7-гадзінны рабочы дзень. Рахункаводу нечага нас вучыць.**

Потым **Глікман** пачаў «сьпяваць» аб зажыме, кулаку і г. д.

Гаварыць яму далі колькі хацеў, каб потым ня крычаў, што не даюць выказвацца. Але затое рабочыя хлапцы потым пасадзілі яго ў галёшу так, што і выбрацца з яе цяжка будзе.

Праўда, былі ў некаторых сумненьні наконт броні, але яна пасьля тлумачэньня дакладчыка расьсеялася і з лініяй ЦК па гэтым пытаньні таварышы згадзіліся.

Вынікі галасаваньня наступныя: за—24, супроць—1 і ўстрымалася—3. **Ізм.**



„Пляцформа", якая зышла з ленінскіх рэек.

Опозіцыянэра-бузацёра па шыям!

Невялікая, але згуртаваная комсамольская ячэйка хімфармзаводу сабралася для прапрацоўкі пытаньня 5-цігадовага пляну народнай гаспадаркі.

Уважліва слухаецца кожнае слова дакладчыка. Раптам увага парушаецца, у дзьвярах зьяўляецца наш гора-опозіцыянэр Кастроў, выключаны БК і Акругкомам з комсамолу.

Па прапанове сакратара ячэйкі ён ня солена хлябаўшы пакідае сход.

Так мы пазбавіліся ад муціль, які не ганьбаваў нават запугваньнем сваю ячэйку, ня кажучы ўжо, што за кароткі час прабываньня ў організацыі (2 гады) яму было пастаўлена на від і вынесена суровая вымова з папярэджаньнем за свае некомсамольскія ўчынкі. І калі пасьля добра прапрацаванага дакладу і аднагалоснага прыняцьця рэзолюцыі, была заслухана інформацыя тав. Шнэйдэра аб выключэньні з комсамолу некалькіх фракцыянэрчыкаў і ў тым ліку Кастрова, дык гэта пастанова была адзінадушна адобрана.

Л. Олікер.

За опозіцыю—ні аднаго.

(Ячэйка ЛКСМБ працмастацтва, Менск).

Сход а 4-й гадзіне. Сакратар ячэйкі сумна паглядвае на дзьверы. Ён памятуе, як раней комсамольцы прыходзілі на сход: «праз гадзіну—па чалавеку».

Але цяпер ён памыліўся. Своечасова зьявіліся ўсе—**да аднаго.**

Да дакладу падрыхтаваўся кожны. Выказацца таксама кожны жадае.

У выказваньнях—аднадумка: Опозіцыя гіне. Тысячы рабочых, якія ідуць у нашу партыю, лепшы доказ правільнасьці політыкі партыі і яе ЦК.

Галасаваньне. Адзін паглядвае на другога: хто падніме руку супроць партыі—за опозіцыю. **Няма такога і ня будзе.**

Кітны Зд.

Мы—за тэзісы ЦК.

(Вайсковая школа імя ЦВК БССР, Менск)

23-га лістапада адбыўся агульны сход комсамольцаў нашай школы. Абгаварваліся тэзісы ЦК УсеКП(б) да 15-га зьезду партыі.

За опозіцыю ня было ні аднаго курсанта Нават самы адсталы комсамолец, які нядаў на прыехаў з цёмнай вёскі, ганебна кляйміў яе, гаворачы: «Опозіцыя нічога практычнага не дае ў сваіх контр-тэзісах, а толькі хоча сьпіхнуць партыю з бальшавіцкага шляху на меншавіцкі».

Было неразуменьне некаторых пытаньняў, але пасьля растлумачэньня іх дакладчыкам—усё стала ясным.

Ні адна рука пры галасаваньні не паднялася супроць тэзісаў ЦК. Вайсковыя комсамольцы, як і ўвесь комсамол, ішлі і будуць ісьці толькі за партыяй, толькі пад сьцягам Леніна.

А—к.

У падпольнай друкарні.



— Што, ці ўсе шрыфты прынёс?
— Усе, акрамя ВКП.

„Мы варочаемся шчырымі прыхільнікамі СССР“

ТАК ЗАЯВІЛІ НАВЕДАЎШЫЯ МЕНСК ЗАМЕЖНЫЯ РАБОЧЫЯ ДЭЛЕГАЦЫІ.

Некалькі дзён у нас гасьцілі прадстаўнікі рабочай моладзі Польшчы і Чэха-Славакіі. Комсамол беларускай сталіцы ўстанавіў з імі цесную сувязь.—Наш рэволюцыйны вопыт будзе сьцягам у барацьбе замежных братоў.

Яны будуць верныя сьцягу КІМ‘у.

На вечары менскай рабочай моладзі.

Засьвяцілася агнямі, забурліла заля клюбу Саўгандальслужачых.

Ужо няма ніводнага вольнага месца.

—„Чаму яны ня ідуць?“ —у 10-ты раз пытаюцца ў організатара вечару. Той нэрвова глядзіць на гадзіньнік і кідае: праз 10 хвілін будуць тут.

Нарэшце, у залі зьяўляюцца чэха-славакія таварышы. Ледзь пасьпелі яны агледзецца, як ужо былі абкружаны комсамольскім натоўпам.

Праская тэкстыльшчыца **Эма Скаліцкая** нікольні не зьбянтэжана накіраванымі на яе дзесяткамі пытлівых поглядаў. За паўхвіліны яна зусім асвоілася з абступіўшай яе моладзьдзю і адчувае сябе іх старой знаёмай.

Адна перашкода ўзаемнаму зблізэньню—мова. Але гэта перашкода хутка перамагаецца, хлопцы гутараць з дэлегаткай на помесі нямецкіх і польскіх слоў, і нічога—абодва бакі—добра разумеюць адзін другога.

З хцівасьцю ловіцца кожнае слова Эмы. А яна не шкадуе слоў і рухаў, каб як мага падрабязьней задаволіць дапытлівасьць хлапцоў. Паўстаюць малюнкі жудаснай эксплёатацыі юнакоў у „дэмократычнай“ Чэхіі, дзе адсутнічаюць усякія правілы аб ахове працы моладзі, апошняя працуе 10-12 гадзін у суткі, атрымлівае мізэрную зарплату і г. д...

У становішчы Эмы апынуліся таксама амаль усе дэлегаты. Такім чынам устанавілася самая сапраўдная спайка паміж нашымі комсамольцамі і замежнымі таварышамі яшчэ да таго, калі тав. **Красоўскі** ад імя Менакругкому ЛКСМБ абвясьціў вечар адчыненым.

* * *

Прапанова ўвесьці ў прэзыдыум увесь склад чэха-славацкай дэлегацыі і прыехаўшага з Польшчы комсамольца тав. **Завіруху** падтрымліваецца доўга-нясьціхаючымі воплескамі. Першае слова атрымаў тав. Завіруха, якому аплёдысмэнты доўга не даюць гаварыць.

— Наша краіна пад кіраўніцтвам Пілсудзкага ўсё больш і больш мілітарызуецца. Дзе ўжо тут паном з сойму, якія заняты плянамі захопу Літвы і пашырэньня тэрыторыі «Жэчы Посполітай», думаць аб такіх «дробязях", як ахова працы рабочых, у прыватнасьці моладзі, паляпшэньне іх матар'яльнага становішча... Урад Пілсудзкага організуе моладзь у фашыцкія гурткі, мілітарыстычную організацыю «Стшэлец» і інш. Марамі аб вялікай старапольскай дзяржаве стараюцца адцягнуць маладога рабочага ад думак аб паляпшэньні свайго экономічнага становішча, ад пытаньняў рэволюцыйнай барацьбы. Але дарма, паное пілсудчыкі!

Польская рабочая моладзь добра разьбіраецца ў політычных пытаньнях і ня хоча быць гарматным мясам для ажыцьцяўленьня вашых мілітарыстычных плянаў. Яна ідзе масамі ў комсамол, ўплыў і шэрагі якого няўхільна растуць.

— **Нех жые комсамол Польшчы! Прэч Пілсудзкага!** Гэтыя запаляючыя лёзунгі, якія кідае з трыбуны **т. Завіруха**, падхапляюцца усёй заляй.

— **Няхай жыве савецкая Польшча!**—нясецца з месц.

Наступны прамоўца — чэха-славацкі дэлегат **Чамара:**

—Чэха-славацкія соцыял-згоднікі разгарнулі шалёную кампанію супроць пасылкі юнацкай дэлегацыі ў першую ў сьвеце краіну саветаў—гаворыць ён.—Яны абманваюць рабочую клясу наконт становішча СССР. Па звароце ў Чэха-Славакію мы прыложым усе свае сілы да высьвятленьня перад масамі ўсяго таго, што мы бачылі.

— Няхай жыве Чырвоная Чэха-Славакія! —заканчвае пад гучнае ўра тав. **Чамара.**

Слова бярэ дэлегат-комсамолец **Рыхтэр:**

— Нашу дэлегацыю за падарожжа ў СССР сустрэнуць у Чэха-Славакіі рэпрэсіі і праследаваньні з боку ўраду і соцыял-дэмократычнай партыі. Але гэта ня спыніць нашай дзейнасьці па заваёве чэха-славацкай рабочай моладзі, па заснаваньню ў нас такога ладу, які існуе ў вашай краіне.

— Чэха-славацкі ўрад зараз моцна ненавізуе насельніцтва. Але, калі ён уздумае паслаць свае вайсковыя сілы супроць савецкай краіны, мы абернем стрэльбы і гарматы на сваю буржуазію, даб'емся расплаты за ўсё тое, што выцярпела за час буржуазнага панаваньня рабочая кляса.

З адказнымі прывітаньнямі выступаюць прадстаўнікі менскай рабочай моладзі.

І дзяўчына-друкарка тав. **Давідовіч**, і гарбар **Пілітовіч** заклікаюць замежных братоў **стрымаць свае словы аб верным інформаваньні рабочых чэха-славацкай краіны.**

Мы спадзяемся, што чырвоныя хусткі, якімі павязаны галавы дэлегатак і КІМ'аўскія значкі, што вісяць на іх грудзёх, ня будуць зьняты пры пераезьдзе за мяжу!..

— **Мы застанемся вернымі дадзенаму вам абяцаньню і сьцягу КІМ'у,**— адказвае на гэта тав. **Рыхталекава** ў канцы ўсіх прывітаньняў.

Усе ўстаюць. Галасы дэлегатаў зьліваюцца з галасамі ўсіх прысутных і тонуць ў моцных гуках Інтэрнацыяналу.

Я. З.

„Наша сяброўства будзе вечнае“.

[illegible]

Рабочая моладзь Менску! Ад імя дэлегацыі чэха-славацкай рабочай моладзі я вам перадаю гарачае прывітаньне. Прабываньне ў Менску тым больш радаснае для нас, што праз некалькі гадзін нам прыдзецца пакінуць дарагую айчызну—СССР. Але мы зварочваемся дахаты з пачуцьцём вашага пролетарскага каханьня і вернасьці. Мы вас дзякуем, таварышы. Нашае сяброўства будзе вечнае.

Божэлена Рыхталекава

Старшыня дэлегацыі чэха-славацкай рабочай моладзі.

ЧЭХА-СЛАВАЦКАЯ ДЭЛЕГАЦЫЯ РАБОЧАЙ МОЛАДЗІ.

Зьлева направа: сядзяць—Эма Скаліцка—тэкстыльшчыца з Прагі, беспартыйная; Божэліна Рыхталекава—старшыня дэлегацыі, служачая, нацыянал-соцыялістка; Чамара—гарняк, соцыял-дэмократ, буйны дзеяч рабочага камітэту адзінства; Язэп Картэш—батрак, сябра клерыкальнай партыі. Стаяць—Вілі Рыхтэр—тэкстыльшчык з Райхэнбэргу, комсамолец, сябра Акругкому КСМ; Артур Фальдзін—сталяр з Прагі, комсамолец-комуніст; Рудольф Гайдрых—будаўнік з Райхэнбэргу, комуніст, сябра ЦК КСМ Чэха-Славакіі.

Auf, auf, zum Kampf!

— А дзе-ж самі дэлегаты? Куды яны схаваліся?

Мой сусед устаў з месца і аглядзеў залю. За доўгімі сталамі шумела комсамольская братва, успыхваў і рассыпаўся сьмех.

— Хто яго разьбярэ—дзе нашыя, а дзе чэха-славакі...

— У гэтых, браток, і ўвесь «цымус», —адказаў я, і мы разам засьмяяліся.

Вячэра, наладжаная ЦК комсамолу ў гонар чэха-славацкай дэлегацыі рабочай моладзі, была ў вясёлым распале, калі Чамара—гарняк з Мараўскай Астравы, соцыял-дэмократ, папрасіў слова.

Ён гаварыў аб СССР, аб тым СССР, які стаў і яго, соцыял-дэмократа, сьцягам, клічучым на барацьбу, які становіцца сьцягам пролетарыяту ўсяго сьвету. Чамара гаварыў аб адзінстве міжнароднага рабочага руху, аб чырвонай Чэха-Славакіі, аб барыкадах, на якіх ён гатоў памерці за справу рэволюцыі.

— Таварышы,—сказаў ён у канцы сваёй прамовы,—мя ня хочам, каб нас называлі меншавікамі, мы ня хочам насіць гэтай ганебнай мянушкі... Па прыезьдзе на бацькаўшчыну, мы паставім пытаньне аб гэтым ва ўсёй гострасьці, і калі справа дойдзе да барыкад—**мы заўсёды будзем з бальшавікамі!**

— Дык няхай жыве комсамоль Менску!—крыкнула Божэліна Рыхталекава—гура! Яна так і сказала—«**комсамоль**», і сама пачырванела ад гордасьці, што гаворыць тэй мовай, на якой размаўляюць яе суседзі—бальшавікі-комсамольцы.

Наогул, пытаньне з мовай у гэты вечар абстаяла досыць востра... Усё-ж такі—гутарылі. Усё пускалася ў ход: і невялічкі запас знаёмых нямецкіх слоў і яўрэйская мова, і польская, і рукі і адпаведныя грамасы—абы зразумелі...

І дэлегаты—разумелі. Яны падцьвярджалі сваю згоду з нашымі думкамі ківўкамі галавы і нешта хутка і горача адказвалі, што—невядома, але, мабыць,—добрае і шчырае...

Засьпявалі. Магутная хваля роднай песьні падняла ўсіх на свой пеністы грэбень, і словы гучэлі выразна-прыгожа, як выразна-прыгожа тая думка, што саткана з іх. Ледзь кончылі, як дэлегаты выказалі жаданьне засьпяваць сваю песьню. Яна завецца «Zum Kampf» («Да барацьбы») і прысьвечана Карлу Лібкнехту і Розе Люксэмбург. Сабраліся ў кучку і дружна засьпявалі. І сярод незнаёмых слоў гэтай песьні мы разумелі асноўнае—самае галоўнае:

„Auf, auf, zum Kampf!
Auf, auf, zum Kampf!“.

Пасьля, у канцы вечару, адзін наш комсамолец гаварыў Божэліне Рыхталекавай аб песьні «Zum Kampf» вось што:

— Добрая песьня... **Але трэба змагацца на справе, а ня толькі гаварыць.**

Божэліна адказала проста і спакойна:

— **Правільна, таварыш.**

* * *

Гэта «Zum Kampf» гучэла і на масавым вечары рабочай моладзі, прысьвечаным чэха-славацкай дэлегацыі.

На гэтым вечары быў яшчэ адзін прадстаўнік замежных братоў — прадстаўнік братэрскага комсамолу Польшчы тав. Завіруха.

І ўсе зразумелі, што значыў той моцны пацалунак **Завірухі з Чамарай**, які раздаўся на сцэне пад шалёныя воплескі ўсей залі. Усе зразумелі, бо так звонка, так упэўнена прагучэла:

— Няхай жыве Чырвоная Польшча! Няхай жыве чырвоная Чэха-Славакія!

* * *

... На засьнежаным паўстанку, каля слупоў польска-савецкай граніцы, ля высокіх варот мы разьвіталіся з чэха-славацкімі таварышамі. Яны плакалі. Толькі гэта ня былі сьлёзы слабасьці, безвольнага суму. Не, гэта былі сьлёзы той агромністай любві, той гэроічнай любві, якая і Божэліну, і Чамара, і Картэша, і Рыхтэра, і тысячы іх братоў і сясьцёр павядзе на барыкады, на рашучае рэволюцыйнае змаганьне.

—Zum Kampf, таварышы, zum Kampf!

Міх Гольдбэрг.

Польская рабочая дэлегацыя

«Масы польскай рабочай моладзі ідуць за комсамолам супроць гнілога ўраду Пілсудзкага»—так заявіў дэлегат Завіруха.

У суботу, 26-га лістапада, у Менск прыехала польская рабочая дэлегацыя, у якую уваходзіць 8 чалавек. Дэлегацыю сустрэлі на вакзале менскія рабочыя організацыі, прадстаўнікі ЦК і Менакругкому КП(б)Б, комсамолу, сябры клюбу імя Розы Люксэмбург і інш.

У суботу днём дэлегацыя наведала заводы Менску («Чырвоная Зара», сельска-гаспадарчыя майстэрні Бурбіса і інш.). Акрамя гэтага, дэлегаты былі на прыёме ў старшыні ЦВК БССР тав. **Чарвякова**, старшыні Саўнаркому—тав. **Галадзеда** і Наркамасьветы—тав. **Баліцкага.**

Вечарам адбыўся сход палакоў Менску, на якім выступалі дэлегаты.

У нядзелю 27-га у памяшканьні кіно «**Культура**» ЦСПСБ наладзіў

вечар у гонар польскіх дэлегатаў.

На вечары выступалі прадстаўнікі рабочых менскіх рабочых і фабрык.

Тав. **Ваўчок** (сельска-гаспадарчыя майстэрні) гаворыць: — Савецкая Беларусь перабудоўваецца на соцыялістычны лад. Застанаўлюся на нашых майстэрнях. За 5 год мы маем столькі дасягненьняў, колькі ня мелі за 50 год пры ўладарах-капіталістым. Наш сярэдні заробак 80 рублёў.

Яскравай стужкай праходзяць другія выступленьні менскіх рабочых. Кожны апавядае аб дасягненьнях свайго заводу, цяжкасьцях і перамогах у працы.

Адказная прамова тав. Сахацкага.

З адказнай прамовай на 4-х дзяржаўных мовах БССР (белар., яўр., польскай, расійскай) выступае старшыня дэлегацыі, комуністычны дэпутат у сойм тав. **Сахацкі**, сустракаемы бурнымі воплескамі. Кожнае яго слова пакрываецца крыкамі «правільна» і працяжнымі воплескамі.

— Мы прыехалі ў савецкую краіну для таго, каб замацаваць сувязь польскага пролетарыяту з пролетарыятам СССР. Польскі пролетарыят бачыць і ведае, як будуецца савецкая краіна і вучыцца на яе прыкладзе. Хутка будзе той час, калі польскі пролетарыят выступіць супроць гнілога ўраду Пілсудзкага, уступіць у тое, што мы завём рэволюцыяй.

— Становішча рабочай клясы ў Польшчы вельмі дрэннае. Аб гэтым гаворыць, напрыклад, такі факт: польскі рабочы атрымлівае ў дзень ня больш 4-х злотых (злоты на нашыя грошы раўняецца 18 к.).

— Пілсудчыкі шмат абяцалі, і таму іх у часе паўстаньня падтрымлівала рабочая кляса. Але цяпер яна на справе бачыць, што пілсудчыкі працуюць толькі для вярхушкі і клапоцяцца толькі аб ёй. На апошніх выбарах у сойм левае крыло атрымала 75 тысяч галасоў. Гэта паказвае на тое, за кім ідзе рабочая кляса.

За ім гаворыць польскі комсамолец тав. Завіруха.

— Ад імя польскага комсамолу перадаю гарачае прывітаньне менскім рабочым. Рабочая моладзь Польшчы зразумела, куды вядзе ўлада Пілсудзкага, і цяпер, як і дарослыя рабочыя, ідзе за комуністычнай партыяй і комсамолам. Шэрагі нашы з кожным днём усё мацнеюць.

— Мы жадаем, каб комсамол Беларусі, каб наогул рабочыя Беларусі завязалі з намі моцную сувязь, каб мы ведалі, што маем заўсёды падтрымку і спачуваньне рабочых першай савецкай краіны.

Н. Акцяброскі.

Плёткі опозіцыі і кулацкая небясьпека.

Калі пачытаць контр-тэзісы троцкісцкай опозіцыі аб працы ў вёсцы і дапусьціць на хвіліну, што ўсё тое, што піша опозіцыя — праўда, дык усякага чэснага комуніста павінна абхапіць жудасьць. Стане ясна, што партыя на ўсіх парах нясецца ў абнімкі да кулака, што партыйная політыка накіравана на тое, каб разьвязаць рукі кулаку і як мага больш прыціснуць беднату і батрацтва.

Але з тэй прычыны, што опозіцыйная об'ектыўнасьць пасьпела ўжо зарэкомэндавацца, як асаблівая об'ектыўнасьць, якая апіраецца на паклёпы і скажэньні фактаў, дык і

да гэтых контр-тэзісаў трэба падысьці вельмі асьцярожна,

у асаблівасьці там, дзе опозіцыя з надта рашучым выглядам падносіць лічбы аб кулацкай небясьпецы. Цэнтр пытаньня: у расплставаньні вёскі. Опозіцыя зацьвярджае, што процэс расплставаньня вёскі ў нас працякае таксама, як і пры капіталізьме. У чым-жа гэта выяўляецца?

Пры капіталізьме расплставаньне вёскі ідзе такім чынам, што асноўная маса вёскі—серадняцкая—расплстоўваецца, альбо як кажуць, „вымываецца“, гэта значыць, пастаўляе з аднаго боку кулакоў, з другога—беднату. Паменшэньне пласту сярэдняга сялянства і рост кулацкага і бядняцкага пластоў—гэта і ёсьць нармальнае для капіталізма зьявішча.

Адбываецца гэта таму, што капіталістычны горад вядзе за сабою вёску; процэсы, якія адбываюцца ў капіталістычнай прамысловасьці выклікаюць рост буйных гаспадарак у вёсцы і абядненьне асноўнай масы сялянства. Гэта асноўнае трэба заўсёды памятаць. Экономічныя адносіны ў вёсцы вызначаюцца экономікай гораду.

Значыць, трэба думаць, што калі экономічныя адносіны ў горадзе зьмяніліся, як гэта адбылося пасьля Кастрычнікавай рэволюцыі, калі ранейшая капіталістычная прамысловасьць перайшла на шлях соцыялістычнага разьвіцьця, справа павінна зьмяніцца таксама і ў вёсцы.

І сапраўды:

Вядучым пачаткам усяго народна-гаспадарчага разьвіцьця зьяўляюцца камандныя гаспадарчыя вышыні, у першую чаргу **буйная прамысловасьць.** Але, калі ў **капіталістычнай** грамадзе вядучая роля гэтых камандных вышынь вызначаецца іх **капіталістычным** зьместам, дык нацыяналізаваная прамысловасьць, крэдытныя інстыт., транспорт, коопэрацыя і гандаль пролетарскай дзяржавы зьяўляюцца магутнейшымі рычагамі соцыялістычнага перабудаваньня вёскі. (Тэзісы ЦК § 2).

Опозіцыя, як быццам, таксама прызнае гэта вядучае значэньне буйнай прамысловасьці, але гэта не перашкаджае ёй разглядаць савецкую вёску, як вёску капіталістычную, якая разьвіваецца па законах капіталізма.

Наша партыя вядзе політыку соцыялістычнага перабудаваньня вёскі,

узьдзейнічаючы на яе буйнай прамысловасьцю, коопэрацыяй, фінансавай політыкай і г. д. І фактам зьяўляецца тое, што савецкая вёска ідзе не па капіталістычным шляху разьвіцьця. Расплставаньне ў нашай вёсцы ёсьць, але гэта зусім асаблівае расплставаньне. Узмацняецца ў нас якраз серадняцкі пласт вёскі, які складае галоўную і асноўную частку нашага сялянства.

Праўда, покуль яшчэ расьце група кулакоў за кошт заможнай часткі серадняков, але бедната скарачаецца, галоўным чынам, дзякуючы яе перасоўваньню ў групу серадняков.

Опозіцыя-ж лічыць, што ў нас расьце кулацтва і бедната, а серадняк „вымываецца“. У доказ яна прыводзіць у сваіх контр-тэзісах лічбы. Але што гэта за лічбы? Гэта адна

фальсіфікацыя.

Опозіцыя прыводзіць лічбы абсьледваньня 1208 сялянскіх гаспадарак. Опозіцыя, вядома, змоўчвае аб тым, што абсьледваньню падпадалі раёны, дзе расплставаньне ідзе асабліва моцна, яна пераносіць вынікі абсьледваньня на ўсе 25 мільёнаў сялянскіх гаспадарак. Але і акрамя гэтага, опозіцыя ўмудрылася так перетасаваць лічбы, што вынікі атрымаліся зусім інакшыя, чым вынікі абсьледваньня. Нават гэтыя лічбы, якія характарызуюць раёны, асабліва рэзкія па расплставаньню гавораць аб тым, што асноўную масу гаспадарак і асноўную сілу на рынку прадстаўляюць серадняки. Падрабязна аб тым, як опозіцыя здабывае лічбовы матар'ял, чытач прачытае ў артыкуле тав. Якаўлева, зьмешчаным у газэце „Правда“ ад 5-га лістапада (там-жа, дзе і контр-тэзісы опозіцыі).

Такім-жа самым „статыстычным“ шляхам опозіцыя даказвае, што кулакі пахавалі нацыяналізацыю зямлі, што коопэрацыя абслугоўвае кулакоў і г. д.

Высмактана з пальца.

Уся бяда опозіцыі ў тым, што партыя мае багаты вопыт, вялікую практыку ў вясковай працы і яе цяжка ўпэўніць тым, што высмактана з опозіцыйнага пальца. Калі параўнаць тэзісы ЦК з контр-тэзісамі троцкістых, бачыш усю розьніцу між дзельнымі вынікамі і практычнымі прапановамі і між панікай аб кулацкім перараджэньні і троцкісцкімі рэцэптамі.

Возьмем пытаньне аб коопэрацыі.

Вядома, што Ленін бачыў у коопэраваньні адзіны шлях, якім вёска, уся масса сялянства зможа прысьці да соцыялізму. Але опозіцыя, якая разглядае нашу коопэрацыю, як абслугоўваючую кулака, бачыць галоўную задачу не ў коопэраваньні вёскі, а ў колектывізацыі, гэта значыць у стварэньні колхозаў (комун, арцеляў па сумеснай апрацоўцы зямлі). Партыя ўдзяляе колхозам і саўхозам вялікую ўвагу (у гэтым можна ўпэўніцца з тэзісаў ЦК), але бачыць у колхозах галоўны шлях соцыялістычнага будаўніцтва ў вёсцы нельга. Надта нікчэмны процант колхозаў (0,18 проц. у 1926 годзе) у агульнай масе сялянскіх гаспадарак, каб на іх можна было апірацца ў справе соцыялістычнага перабудаваньня вёскі. Толькі коопэрацыя, нават самая прымітыўная, здольна ўцягнуць усякага радавога селяніна ў соцыялістычны процэс. Колхозы зьяўляюцца высшай ступеньню, тонучай у масе асобных сялянскіх гаспадарак, а Ленін гаварыў аб „магчыма больш простым, лёгкім і даступным для селяніна“ шляху да соцыялізму.

Пустыя, дзяшовыя парады.

Опозіцыя задалася задачай выправіць лінію партыі ў вёсцы. Але процівапаставіць гэтай лініі што-небудзь, акрамя пустых і дзяшовых парадаў, опозіцыя ня можа. Партыя вяла і вядзе штодзенную барацьбу за соцыялістычную перабудову вёскі. Яна не хавае ні ад каго і ад сябе ў першую чаргу, тых скажэньняў партыйнай лініі, якія ёсьць. Партыя бярэ курс на абмежаваньне росту кулака і яна гэта праводзе практычна і падзелавому.

Партыя ў сваей працы орыентуецца на ажыўленьне саветаў, на пашырэньне бядняцка-серадняцкага актыву, на батрацтва. Гэта і ёсьць партыйная лінія.

Опозіцыя імкнецца забегчы зайцам наперад

і паказаць справу так, што ЦК шмат чаго ў сваіх тэзісах пазыкаў у опозіцыі. Што тут можна сказаць? Хіба толькі тое, што партыі, якая вядзе сталую настойлівую працу ў вёсцы, няма патрэбы запрашаць парадаў у бяспрынцыпных політыканаў, і наогул з якога гэта часу бальшавікі пачалі вучыцца політыцы ў вёсцы ў Троцкага?

С. МІЛЕЙКА.

Як хто адзначыў Кастрычнік.

Конкурс „Чырвонай Зьмены“ і Кастрычнікавай камісіі.

Арэхаўскія комсамольцы, шляхам правядзеньня антырэлігійных гутарак даказалі і выкрылі ўсю рэлігійную хлусьню.—Яўрэйскае насельніцтва згадзілася аддаць сінагогу пад клюб.—Комсамольцы сваімі сіламі і сродкамі з „сьвятога“ памяшканьня зрабілі культурную ўстанову.

Яўрэйская сінагога стала клюбам.

№ 19. Арэхаўская ячэйка ЛКСМБ, Ветрынскі раён, Полацкая акруга.

Чатыры гады існуе Арэхаўская комсамольская ячэйка. За гэты час яна шмат чаго зрабіла карыснага для вёскі: **арганізавала пажарную дружыну, ячэйку ТСА-Авіяхіму, Мопру, адчыніла хату-чытальню і два ленінскія куткі. Па ініцыятыве комсамольцаў частка сялян выпісвае газэты; паасобныя гаспадаркі перайшлі да культурнага землякарыстаньня.**

Перад Кастрычнікам, у нашых комсамольскіх газэтах пачалі ўсё часьцей і часьцей зьяўляцца допісы, якія бадзёрымі радкамі апавядалі аб маладзёжных падарунках Кастрычніку.

Што нам прыпаднесьці? Што мы можам зрабіць? Якая праца, якое мерапрыемства ў нашых умовах будзе найбольш каштоўным?— Вось пытаньні, якія хвалявалі комсамольцаў і ўсю беспартыйную моладзь..

Застанавіліся на пабудаваньні клюбу ў вёсцы Арэхаўцы.

Справа крапатлівая і дужа цяжкая, але перад цяжкасьцямі мы не палохаемся, а наадварот, бачачы іх, яшчэ больш запальваемся жаданьнем перамогі, жаданьнем выканаць свае мерапрыемствы.

Парашылі збудаваць клюб без вялікіх затратаў сродак, а значыць—трэба знайсьці гатовае памяшканьне.

Спадабалася ўсім яўрэйская сінагога. Добрая будыніна. Ходзяць комсамольцы, толькі губкі аблізваюць, паглядаючы на раскошную сьветлую будыніну.

Энэргічна ўзяліся праводзіць сярод яўрэйскага насельніцтва антырэлігійныя гутаркі, індывідуальныя пераканаваньні за тое, каб сінагогу перабудаваць на клюб.

Пасьля некаторай «агітацыйнай барацьбы» яўрэі згадзіліся перадаць сваю сінагогу пад грамадзка-карыснае памяшканьне—клюб.

Склалі клюбны савет—два таварышы ад комсамольскай ячэйкі, два ад сялян, два ад пажарнікаў, адзін таварыш ад яўрэйскага насельніцтва—і даручылі яму адшукаць сродкі для канчатковага абсталяваньня клюбу.

Разгарнулі сярод сялян працу па зборы сродкаў, вярбоўку і адшуканьне спэцыялістых па абсталяваньню (шкляры, муляры, сталяры і г. д.). Стараліся прыцягваць майстроў да працы бясплатна і толькі некаторым прышлося плаціць.

Уся гэта праца прайшла пасьпяхова, сялянства прыхільна адклікалася на комсамольскі прызыў.

Сабралі сродкі на куплю патрэбнага матар'ялу, далі рабочую і гужавую сілу— і праца каля шэрай сінагогі закіпела.

* * *

Ветрынскі райкомол, падводзячы вынікі правядзеньня кастрычнікавых дзён комсамольскімі ячэйкамі, паставіў арэхаўскіх комсамольцаў у прыклад усім іншым ячэйкам раёну. У яго матар'ялах, прысланых у рэдакцыю, значыцца:

Ячэйка, праз сваю ўмелую антырэлігійную працу змагла дабіцца згоды ад яўрэйскага насельніцтва мястэчка Арэхаўка аддаць сваю сінагогу пад клюб.

Ня маючы ні якіх сродкаў, ячэйка праз суботнікі пераабсталявала сінагогу на клюб, які зараз запраўды адпавядае свайму прызначэньню. Комсамольцы прывезьлі лесу, напілавалі дошак, зрабілі добрую сцэну, нарабілі лавак, сабралі грошай па падпісным лісце сярод насельніцтва, якое давала ахвотна; на сабраныя грошы купілі шкла, завескі, пашклілі падвойныя вокны, пабялілі сьцены і г. д.

Вялікае дасягненьне ячэйкі яшчэ зьяўляецца і ў тым, што яна прыцягнула да суботнікаў беспартыйнае насельніцтва. Працавалі два дні поўнасьцю і пяць вечароў. Усяго прыняло ўдзел беспартыйных 40 чалавек моладзі і дарослых.

5-га лістапада зрабілі адчыненьне клюбу, якое прайшло з вялікай урачыстасьцю. У гонар адчыненьня клюбу быў організаваны вечар, сяляне віталі ячэйку за добрую справу, адзначалі, што ў **гэта вялікае сьвята ёсьць куды сабрацца і падвесьці вынікі сваёй працы.**

7-га лістапада ячэйка організаваным парадкам, сумесна з беспартыйнымі, дэмонстравала ў вайсковую частку, дзе і праводзіла сьвята.

Арэхаўская ячэйка знаходзіцца на самай мяжы з Польшчай.

Сяляне, выступаючы з прамовамі на ўрачыстым мітынгу, зьвярталіся да польскіх паноў:

— „Эй, вы беларучкі панскія! Глядзеце, як у працы і барацьбе гартуюцца будаўнікі нашага жыцьця новага—вашы магільшчыкі“.

У будучым—адсьвяткуем лепш.

№ 20. Путчынская ячэйка ЛКСМБ Койданаўскага раёну, Меншчына.

Наша Путчынская ячэйка ЛКСМБ Кастрычнікавае сьвята хоць і з малою падрыхтоўкай, але правяла ня кепска. Рыхтаваліся ўсяго якія-небудзь два тыдні, але з усёй шчырасьцю і напружанасьцю.

З тае прычыны, што наша ячэйка яшчэ слабенькая, уся падрыхтоўчая праца к сьвяткаваньню 10-цігодзьдзя Кастрычніка вялася разам з ячэйкай КП(б)Б пры ўдзеле яшчэ сельсавету і іншых грамадзкіх організацый, існуючых у сельсавеце.

Хоць у параўнаньні з іншымі ячэйкамі Беларусі мы Кастрычнікавае сьвята правялі і слабавата, але ў нашых цяперашніх умовах, аб чым казалі нават і пажылыя сяляне, дык сьвята 10-цігодзьдзя Кастрычніка прайшло лепш за ўсе папярэднія сьвяты.

Пастановай камісіі па правядзеньні Кастрычнікаўскага сьвята ў 6 пунктах нашага сельсавету комсамольцамі пры дапамозе партыйцаў былі праведзены сходы сялян з пытаньнямі аб тых дасягненьнях, якія наша савецкая краіна мае да 10-цігодзьдзя Кастрычніка.

Сіламі ячэйкі разам з беспартыйнымі вялася падрыхтоўка мастацкае часткі. Падрыхтавалі п'еску і дэклямацыю.

Вечар 6 лістапада—гэта ўрачысты вечар. Татарская школа сялянскае моладзі перапоўнена моладзьдзю і старымі сялянамі. Урачыстае пасяджэньне пленуму сельсавету з усімі організацыямі і сялянамі. Кароценькія бадзёрыя прывітальныя словы прадстаўнікоў ад організацый. Жывыя радасныя словы дакладчыка і ўрачыстае адчыненьне у былым двухпавярховым будынку ў маёнтку Татаршчына **польскай школы сялянскай моладзі.** Словы загадчыка гэтае школы тав. **Згурскага** былі воплескамі сялян заглушаны. На адчыненьні ў нашым сельсавеце такой навучальнай установы, як школа сялянскай моладзі, зробіць нас яшчэ адсталы памежны сельсавет перадавым і культурным сельсаветам. Пры школе адчыніліся двух-гадовыя курсы краўцоў і маецца на мэце з будучага году адчыніць яшчэ сьлясарны цэх. Заняткі ў школе хутка пачнуцца. Інтэрнат гатоў, лазьня гатова, адчыніцца млын і г. д. Гэтая школа,—адзін з лепшых падарункаў ня толькі для сялян нашага сельсавету, але і для сялян усёй Беларусі.

7-га лістапада яшчэ з раніцы к памяшканьню хаты-чытальні і сельсавету сьцякаюцца сяляне, моладзь і вучні. Кароткі мітынг на двары, пасьля якога вучням былі раздаены падарункі.

Так правялі мы кастрычнікавае сьвята. Наступнае сьвята будзе праведзена ня так, бо адчыненая школа дала многа комсамольцаў і нашая ячэйка вырасла якасна, і мы зможам у будучым рэволюцыйныя сьвяты праводзіць куды лепш.

Алесь.

Ці пацікавіўся ты,

як працуе ваш коопэратыў?

„Ня ў бабу гуляць“, а паляпшаць працу коопэратыву.

Мінулыя перавыбары коопэрацыі паказалі, што маладыя сяляне былі зусім слаба ўцягнуты ў гэту організацыю. **У асабліва́сьці слаба была коопэравана бядняцкая моладзь.** Шмат хто з беспартыйнай сялянскай моладзі ня толькі ня прымае ніякага ўдзелу ў працы коопэрацыі, але часам ня мае аб ёй ні малейшага разуменьня. Моцна распаўсюджана і сярод комсамольцаў **коопэратыўная няграматнасьць.**

Бывае, што комсамольцы, замест таго, каб дапамагаць партыі організоўваць, пашыраць, узмацняць коопэрацыю, глядзяць на яе скрозь пальцы, адмахваюцца рукамі і нагамі: **«і бяз нас управяцца».**

У адным сельсавеце, Рэчыцк. раёну (Гомельская акр.), комсамольцы так «дапамаглі» коопэрацыі. Сяляне сабраліся ў школьны будынак для перавыбараў праўленьня коопэратыву, а моладзь на чале з комсамольцамі, з гармонікам і дзяўчатамі пайшлі на вячоркі, і там прагулялі ўвесь вечар. Зразумела, чаму пайшчыкі там ня выбралі ў праўленьне комсамольцаў і моладзі, а іх кандыдатуры правалілі. У некаторых вёсках яшчэ моладзь не заслужыла давер'я сялян. **«Куды ім сунуцца ў гаспадары, гэта ня ў бабу гуляць».**

І наогул маецца шмат заганаў, дрэнных прыкладаў у гэтай рабоце. Няшмала сярод сялянскай моладзі і дзелавых работнікаў, якіх ставіць у абразец, у прыклад дарослым. Вось, напрыклад, **задубскія комсамольцы карыстаюцца ў сялян, асабліва ў беднаты, вялікай пашанай.**

Чаму гэта так?

А таму, што задубскія комсамольцы **ўцягнулі ў коопэрацыю ўсю беднату, таму, што яны цікавяцца жыцьцём і працай коопэратыву, адзначаюць яго недахопы і заганы выпраўляюць памылкі.**

Мінулыя перавыбары, апрача адмоўных і станоўчых прыкладаў работы моладзі, пераканалі нас у тым, што моладзь пачала прымаць больш актыўны практычны ўдзел у коопэрацыйным будаўніцтве.

Апрача павялічэньня колькасьці комсамольцаў і моладзі ў праўленьнях коопэратываў, у рэвізійных камісіях, мы маем значнае павялічэньне практычных прапаноў з боку моладзі па пытаньнях паляпшэньня коопэрацыйнай працы, мы маем шмат фактаў, калі пайшчыкі адносяцца да комсамольцаў з вялікім давер'ем, выбіраюць іх у праўленьні, даручаюць ім адказныя працы.

Такія погляды—хворыя.

У надыходзячых перавыбарах комсамольцы павінны прысьці на перавыбарчы сход падрыхтаванымі. Трэба загадзя заслухаць справаздачу комсамольца, працуючага ў коопэратыве, трэба загадзя прапрацаваць тыя прапановы, з якімі ячэйка выступіць на перавыбарчым сходзе.

У некаторых вёсках наглядаюцца яшчэ такія выпадкі, калі сяляне-пайшчыкі, баючыся за лёс сваіх сродкаў, укладзеных у капітал коопэратыву, выбіраюць у праўленьне больш заможных, кулацкіх гаспадароў. Гэта яны тлумачаць тым, што **«калі старшыня прап'е шмат грошай, дык можна ўзяць з яго гаспадаркі, а з бедняка што возьмеш?».**

Такія моманты—хворыя факты і іх трэба пазьбягаць у надыходзячых перавыбарах. Сярод беднаты і батракоў ёсьць шмат людзей, якія будуць добрымі працаўнікамі, якія будуць увесь час клапаціцца, каб коопэрацыя садзейнічала паляпшэньню дабрабыту бедняка і батрака, каб праз коопэрацыю ўзмацняўся саюз бедняка з серадняком у барацьбе супроць кулака. Трэба толькі такога таварыша спачатку падтрымаць, калі ён ня ўсё разумее, растлумачыць яму.

Не заўсёды яшчэ скарыстоўваюцца фонды, адпускаемыя дзяржавай для коопэраваньня беднаты. У гэтых адносінах—комсамольцы павінны зьявіцца найлепшымі штурхачамі для поўнага скарыстаньня такіх фондаў, для ўцягненьня беднаты і батрацтва ў коопэратывы.

Ход перавыбараў справаздачных сходаў трэба ўсебакова асьвятляць на старонках нашай газэты, **каб чытаючы аб дрэнных прыкладах працы лішні раз пераканацца ў тым, як ня трэба працаваць, каб чытаючы аб добрых узорах, навучыцца, як трэба працаваць, як уцягнуць моладзь у коопэрацыйнае будаўніцтва, як палепшыць працу сярод коопэратыву.**

Наладжвайце тыднёвікі коопэрацыі

Надыходзіць час перавыбараў коопэрацыйных работнікаў. Я прапаную, як стары коопэрацыйны работнік, каб на справаздачных сходах абавязкова прысутнічалі ўсе комсамольцы і прымалі актыўны ўдзел у абгаварэньні працы коопэратыву. Таксама ім трэба загадзя падрыхтаваць батракоў і беднату да гэтага сходу і паклапаціцца, каб яны прынялі самы актыўны ўдзел у абгаварэньні працы старога праўленьня.

Нашы коопэратывы яшчэ часта кульгаюць на абедзьве нogі. Каб яны сваю працу палепшылі, комсамольцам трэба разгарнуць сваю працу.

Не пашкодзіць, калі ячэйка вызначыць тыднёвік, або двухтыднёвік коопэрацыі і ў гэты час у клюбах, у хатах-чытальнях, на занятках гурткоў, на масавых вечарынках будзе праводзіць растлумачваньне аб коопэрацыі і гэтым самым будзе зьнішчаць коопэрацыйную няграматнасьць.

А калі ўсе комсамольцы будуць коопэраваны, яны будуць мець магчымасьць выхаваць з сябе добрых коопэрацыйных работнікаў.

Наш лёзунг перад перавыбарамі коопэрацыі—**усе комсамольцы ў шэрагі пайшчыкаў коопэрацыі.**

Чалей.

Міжнародны агляд.

Крот рэволюцыі рые.

Крызіс ангельскай вугольнай прамысловасьці.—Чарговая здрада вярхушкі ангельскіх профсаюзаў.—Наступленьне капальняўласьнікаў на французскіх вуглякопаў.—Расстрэл рабочых у «свабоднай» Амэрыцы.—Пагроза новай вайны.

Барацьба між масамі і правадырамі.

Ангельская вугольная прамысловасьць перажывае надзвычайна вялікі крызіс.

Крызіс гэты адбіваецца на становішчы рабочае клясы і ў першую чаргу на становішчы вуглякопаў.

За мінулы год у Англіі зачынілася 283 капальні.

Беспрацоўных вуглякопаў налічваецца зараз 400 тысяч чалавек; іншымі словамі, каля паловы ўсіх ангельскіх вуглякопаў.

У розных частках Англіі беспрацоўныя наладжваюць дэмонстрацыі з запатрабаваньнем павялічэньня дапамогі.

У часе аднэй дэмонстрацыі ў Заходняй Англіі, 15 тысяч вуглякопаў атрымалі такі адказ:

«Ідзеце ў Лёндан (сталіца Англіі), там прычына ўсіх цяжкасьцяў».

Такім чынам погляд вуглякопаў накіроўваўся на Лёндан.

І гэта зусім натуральна.

Таму што выходам з дрэннага становішча вуглякопаў зьяўляецца рашучая барацьба з буржуазіяй.

Але буржуазію абараняюць згодніцкія правадыры профсаюзаў.

Таму ў першую чаргу барацьба разгортваецца паміж масамі і афіцыйнымі профсаюзнымі правадырамі.

Гісторыя паходу ў Лёндан яскрава адбівае гэтую барацьбу.

Калі яшчэ 16 верасьня было прапанована організаваць паход вуглякопаў у Лёндан, гэта ідэя горача была падхоплена гарняцкімі масамі.

Быў адразу організаваны камітэт па організацыі паходу.

У Лёндане ўзьнік камітэт па спатканьні вуглякопаў-удзельнікаў паходу.

З пачатку шмат якія організацыі рабочых рашылі падтрымаць паход, але калі організатары паходу зьвярнуліся да выканкому вуглякопаў з просьбай узяць на сябе правядзеньне паходу, дык выканком заявіў, што гэта справа Генэральнага (усеангельскага) савету профсаюзаў.

Генсавет, у сваю чаргу, адмовіўся ў падтрыманьні.

Лёнданскі савет профсаюзаў перш прыняў энэргічны ўдзел у організацыі спатканьня ўдзельнікаў паходу, а потым вышаў з камітэту.

Такім чынам, адна рэформісцкая організацыя за другой адмовіліся падтрымаць беспрацоўных вуглякопаў.

Прычым для апраўданьня свайго здрадніцтва профсаюзныя бюрократы пачалі распаўсюджваць хлусьню, нібыта паход зьяўляецца зацеяй комуністых.

Ня гледзячы на здрадніцтва профсаюзнай вярхушкі, організатары і ініцыятары паходу засталіся вернымі сваёй справе да канца.

Задачамі гэтага паходу, у якім прымала ўдзел 250 чалавек, зьяўляецца: прыцягненьне грамадзкай увагі да цяжкага становішча вуглякопаў і патрабаваньне дапамогі з боку ўраду.

Ува ўсіх гарадох і рабочых пасёлках, удзельнікі паходу сустракаліся рабочымі дэмонстрацыямі, пры чым усюды рабочыя дапамагалі харчамі, кватэрамі і нават грашыма.

У Лёндане вуглякопаў спаткала 15 тысячная дэмонстрацыя рабочых.

Важна адзначыць тое, што паход быў організаваны насуперак жаданьню профсаюзных правадыроў.

Усім паходам кіравалі нізавыя профсаюзныя організацыі.

Паход яскрава паказаў тую барацьбу, якая ідзе між ангельскімі рабочымі масамі і «правадырамі», і тое, што ўплыў комуністычнай партыі на рабочыя масы увесь час расьце і пашыраецца.

Барацьба французскіх вуглякопаў.

Ня ў лепшым становішчы знаходзяцца вуглякопы Францыі.

Французскія капальняўласьнікі таксама наступаюць на прыцоўны дзень вуглякопаў і на заработную плату.

Але яны заняты, пакуль што, адшуканьнем месца, дзе, у якім раёне менш згуртаваны вуглякопы, адкуль лепш пачаць атаку.

Трэба сказаць, што гэта разьведка праваліліся.

У цэлым шэрагу раёнаў капальняўласьнікі сустрэлі рашучы і дружны адпор вуглякопаў і прымушаны былі адступіць.

У адным раёне ім прышлося нават адмовіцца ад ужо абвешчанага лёкауту (звальненьня ўсіх рабочых).

Аднак, неабходна памятаць, што вялікая раздробленасьць сіл французскіх вуглякопаў прадстаўляе ім вялізарную небясьпеку ў будучай барацьбе.

Расстрэл вуглякопаў у Амэрыцы.

Шмат хто з нас, па сваёй неасьвядомленасьці лічыць, што лепш за ўсіх жыве рабочы Злучаных Штатаў.

У так званай краіне Форда і Рокфэлера. Але гэты погляд зусім памылковы.

Вось ужо семь месяцаў 150 тысяч рабочых вугальнай прамысловасьці, вядуць упартую барацьбу за паляпшэньне свайго становішча.

Бастуюць вуглякопы штату Колёрадо.

Кожны дзень адбываюцца дэмонстрацыі рабочых.

У провінцыі Колёрадо, у часе аднэй дэмонстрацыі, адбылася сутычка рабочых з паліцыяй.

Бастуючыя ішлі бяз зброі і нават з амэрыканскім, (а ня з чырвоным) сьцягам.

Паліцыя зусім нечакана адчыніла па дэмонстрацыі агонь з вінтовак і кулямётаў.

У выніку—19 чалавек забітых.

Па запатрабаваньню капальняўласьнікаў, губэрнатар Колёрадо накіраваў у бастуючыя раёны моцныя атрады войск, а таксама танкі і самалёты.

Ужо шмат рабочых арыштавана. Сотні высланы, і ўсе рабочыя організацыі зруйнаваны.

І ўсё гэта робіцца ў «дэмократычнай» і «свабоднай» Амэрыцы.

Комуністыя і соцыялісты Нью-Ёрку організуюць супольна мітынгі ў знак протэсту супроць расстрэлаў.

Цікава адзначыць тое, што ня гледзячы на расстрэлы і провокацыі, бастуючыя трымаюцца досыць моцна.

Усе рабочыя організацыі дапамагаюць вуглякопам у іх барацьбе супроць эксплёатацыі і тэрору.

Клясавая барацьба разгортваецца і ў Амэрыцы.

Здань комунізму ходзіць і па Амэрыцы.

Алёнін.

Агляд абутковай фабрыкі закончыўся

Зараз на фабрыцы паднялася актыўнасьць рабочых, палепшылася абучэньне вучняў. Дасягненьні гэтыя трэба замацаваць.

Усё, дзякуючы агляду.

(Малюнкі)

По таварыску—цёпла сустрэлі фабрычныя хлапцы.

— А! Рэдакцыя? Чаму гэта ўжо забылі нас?

— А на фабрыцы за гэты час, шмат чаго новага маецца,— апавядаюць адзін за другім маладыя абуўнікі,

— Вунь,—паказваючы налева, кажа хлапец, які адвозіць ваганетку з ботамі,—наша новая цьвікавачная машына. Яна замяніць ручную працу рабочых нацяжнога аддзяленьня.

Каля новай машыны гурбою зьбіраюцца рабочыя, А машына гудзе, сьпяваючы вясёлую песьню працы.

Прыёмшчык Герайціс з шырокай ухмылкай на твары радасна перадае аб тым, што малады Гарэлік, з якім ён калісь-ці [illegible] „на нажах", зараз зусім ня той.

— Гарэлік да мяне зараз адносіцца досыць добра. „Чырвоная Зьмена" дапамагла гэтаму.

— А я,—прызнаецца Гарэлік,- кепска рабіў раней, Я асазнаў свае памылкі.

Другія хлапцы цікавяцца сваімі дописамі, што яшчэ ня былі надрукаваны ў газэце.

Перадай,—просяць яны,—каб зьмясьцілі.

У астатніх цэхах тое-ж самае. Усюды на фабрыцы адчуваецца штось-ці новае, і ўсё гэта, кажуць рабочыя, дзякуючы агляду

Дзякуй „Чырвонай Зьмене"!

М. ГАЗЭТНЫ.

Трэба выканаць пастановы нарады

Слова работніцы аддзелачнага аддзяленьня т. Чарапахінай

Агляд нашай фабрыкі прайшоў добра толькі таму, што ўсе пытаньні жыцьця фабрыкі абгаварваліся і вырашаліся на вытворчых нарадзе і камісіі пры непасрэдным актыўным удзеле саміх рабочых.

Рэдакцыя „Чырвонай Зьмены" не абмежавалася толькі апісаньнем фактаў, але і прыняла ўсе захады да правядзеньня іх у жыцьцё. Гэта дае нам права спадзявацца, што ні адзін з допісаў не застанецца толькі кавалкам газэтнай паперы, „гласом вопиющего в пустыне".

Адначасова трэба адзначыць, што не ўсе рабочыя былі уцягнуты ў правядзімы агляд. Дзякуючы гэтаму, некаторыя пытаньні жыцьця фабрык засталіся на „пазадворках" агляду.

У прыватнасьці, ня досыць дасканала высьветлена пытаньне аб кваліфікацыі нашых работніц. Т-в. Русановіч, якая высунула гэта пытаньне, сама не зьявілася на вытворчую нараду, дзе абгаварваліся матар'ялы агляду. У выніку пытаньне гэта засталося ня зусім вырашаным.

Мы, рабочыя фабрыкі, жадаем, каб адміністрацыя хутчэй выканала ўсе пастановы вытворчай нарады па пытаньнях праведзенага агляду. З свайго боку мы прымем да гэтага ўсё, залежачае ад нас саміх і не паслабім увагі да працы і пасьля агляду.

Агляд ажывіў проф. працу.

Слова старшыні ЦП саюзу скурнікаў т. Раманава.

Адначасова з аглядам фабрыкі, наладжаным „Чырвонай Зьменай", ЦП нашага саюзу праводзіла абсьледваньне працы фабкому.

Абсьледваньне паказала, што большасьць дырэктыў ЦП фабкомам ня выканана.

Фабком слаба кіраваў працай камісій. Вытворчыя нарады склікаліся нерэгулярна. Шмат недахопаў было і ў пастаноўцы вучнёўства.

Па матар'ялах агляду фабрыкі і абсьледваньня Цэнтральнага Праўленьня, фабкому дадзены шэраг практычных „паказаньняў у яго далейшай працы.

Праведзены „Чырвонай Зьменай" агляд у некаторай ступені ўжо даў свае вынікі і ў галіне прафэсыянальнай працы на фабрыцы. Адчуваецца павялічэньне актыўнасьці рабочых і некаторае ажыўленьне працы фабкому.

Майстры лепш абучаюць нас,—

заяўляе вучань загатоўчага аддзяленьня т. Сагаловіч.

У загатоўчым аддзяленьні, дзе я працую, некаторыя мерапрыемствы, высунутыя «Чырвонай Зьменай» у часе агляду, ужо ажыцьцёўлены.

Прыступлена да пераабсталяваньня аддзяленьня. Замест вялікіх скрынак на 50 пар абутку, зараз устаноўлены 10-ці парныя скрынкі. Дзякуючы гэтаму, рабочыя менш губляюць дарэмнага часу на вытворчасьці.

З навучаньнем „бронявікоў" раней справа абстаяла ненормальна. Пасьля агляду некаторыя вучні ўжо пераведзены на больш кваліфікаваную працу.

Майстры пачалі больш удзяляць увагі навучаньню падросткаў. Узаемаадносіны паміж майстрамі і вучнямі значна палепшыліся.

Але і зараз, на жаль, прыходзіцца, канстатаваць, што некаторыя каштоўныя пастановы нарады майстраў і вучняў у галіне вучнёўства яшчэ ня выкананы. Ня зусім добрым засталося становішча на вытворчасьці вучняў Юдэлевіч, Галенсона і іншых.

Гэты недахоп павінен быць зьнішчаны ў хутчэйшым часе.

Адбыўся пленум Вышэйшага Савету Фізкультуры.

Уводзіцца адзіны фізкультурны білет.—Вызначаны парадак спатканьняў з замежнымі рабочымі спорткамандамі.—У лютым 1928 г. у БССР будзе праведзены зьвёздны лыжны прабег.—Распрацавана праграма зімовага сьвята фізкультуры.

Учора закончыўся пленум ВСФКБ. Упяршыню ў працы пленуму прымала ўдзел замежная дэлегацыя рабочых фізкультурнікаў.

Выступіўшы з дакладам аб працы чырвонага Спорт'інтэрну генэральны сакратар выканкому ЧСІ тав. **Каплан** ахарактарызаваў становішча міжнароднага спартыўнага рабочага руху і спыніўся на працы беларускай сэкцыі.

Наша сэкцыя мае значныя дасягненьні ў галіне інтэрнацыянальнай сувязі.

> Правесьці ў лютым 28-га году зьвёздны лыжны прабег у БССР. Канчатковы пункт—Магілеў.

Чым зьявіцца гэты зьвёздны прабег для фізкультурнікаў Беларусі? Ён унясе ваенізуючы элемэнт у працу фізкультарганізацый, ён прывучыць нашых хлапцоў да вялікіх пераходаў і будзе найлепшай трэніроўкай па выносьлівасьці да зімовага сьвята.



Чэха-славацкая фізкультурная дэлегацыя з сэкратаром ЧСІ тав. Капланам (у авале).

Пленум прыняў рашэньне аб увядзеньні **адзінага фізкультурнага білету** і вызначыў парадак **спатканьняў з замежнымі фізкультурнікамі.**

Пленум таксама аддаў шмат увагі пытаньням фізкультурнай працы на вёсцы. Да гэтай працы прыцягваюцца органы палітасьветы і вясковая інтэлігенцыя.

У сваю чаргу вясковыя фізкультурнікі павінны праявіць больш самадзейнасьці, больш ініцыятывы ў організацыі пляцовак і новых гурткоў.

Фізкультурнікі ваенізуюцца. Гэта адзначыў пленум і для ўзмацненьня пачатай справы ўхваліў:

Апрача гэтага будуць праведзены масавыя манэўры і пераходы на лыжах у акругах.

Пленум таксама распрацаваў праграму ўсебеларускага зімовага сьвята фізкультуры.

Лыжныя спаборніцтвы займаюць галоўнае месца ў програме сьвята. Будзе праведзены бег на 5 і на 10 кілёмэтраў у поўным ваенным абмундыраваньні з вінтоўкай і процівагазам. У часе 10-цікілёмэтравага бегу—стральба па мішэнях.

Бег на каньках будзе на 1500 і 500 мэтраў. Апрача гэтага, у програму ўваходзіць барацьба і падняцьце цяжкасьцяў.

У тры радкі.

— У Менску організаваліся **курсы** шофэраў, на якія прынята 40 чалавек.

— У пачатку сьнежня склікаецца ўсебеларускі зьезд транспартных рабочых.

— Пры Медфаку БДУ адчынены **новыя кафэдры**—біолёгічнай хіміі і агульнай паталёгіі..

— Белжылсаюз асыгнаваў 485 тысяч рублёў на кватэрнае будаўніцтва ў 1927-28 годзе.

— Кампанія перазаключэньня калдагавораў працягнецца у БССР да 1-га студзеня 1928 году.

— Будуецца новы пасёлак для рабочых МББ чыгункі.

— Белдзяржкіно засьняла для кіно-хронікі працу 11-га зьезду КПБ.

— Наркамзем вызначыў закупіць для БССР 74 новыя трактары савецкай і замежнай вытворчасьці.

— У Барысаве і Рэчыцы будуюцца 2 новыя сярніковыя фабрыкі.

Ад'езд чэха-славацкай фізкультурнай дэлегацыі.

Учора з вакзалу МББ ад'ехала дэлегацыя чэха-славацкіх фізкультурнікаў. На вакзале дэлэгацыю праваджалі члены ВСФК і менскія фізкультурнікі.

Адчыняецца каток.

У сувязі з устанавіўшымся надвор'ем каток Менскай лыжнай станцыі наліваецца вадою.

Калі ўсе гэтыя дні будуць стаяць марозы, каток адчыніцца праз 5 дзён.

Новая партыя лыж.

Культаддзел ЦСПСБ закупіў партыю лыж, якая перадаецца Менскай станцыі.

Усяго на станцыі будзе каля 200 пар лыж.

Сёньня—збор дапрызыўнікаў.

Сёньня, а 10 гадзіне раньня, усе дапрызыўнікі 1906 году нараджэньня, пражываючыя на Меншчыне, павінны зьявіцца на свае пункты для праходжаньня дапрызыўнай падрыхтоўкі.

Гарадзкім дапрызыўнікам належыць зьявіцца на вучэбны пункт па вуліцы Бакуніна, д. № 6.

Сёньня і заўтра на пунктах будзе праведзены мэдыцынскі агляд усіх дапрызыўнікаў. Тыя дапрызыўнікі, якія праходзілі абучэньне ў мінулым годзе, мэдыцынскаму агляду не належаць.

Дапрызыўнікі, якія будуць прызнаны здаровымі, ніякіх водпускаў больш не атрымаюць і адразу-ж застаюцца на пункце для праходжаньня вайсковай вучобы. Дапрызыўнікі павінны ўзяць з сабой харчы і пасьцельныя прыналежнасьці на 10 дзён.

Ад дапрызыўнай падрыхтоўкі ніхто не аслабаняецца, за выключэньнем студэнтаў першых 3-х курсаў БДУ, першых 2-х курсаў Комвузу, а таксама 4-га курсу. пэдагагічнага і 5 курсу мэдыцынскага факультэтаў. Таксама аслабаняюцца ад яўкі на дапрызыўную падрыхтоўку штатныя рабочыя і служачыя чыгункі і асобы, пазбаўленыя выбарчых правоў.

Дапрызыўная падрыхтоўка пачынаецца 1-га сьнежня. Закончыцца яна 12 студзеня 1928 г.



За зімовай працай.

Гурток ваенных ведаў.

Разгортваючы зімовую працу гуртка вайсковых ведаў, ня трэба **задавацца якімі-небудзь вялікімі і складанымі задачамі.**

Непадрыхтаванаму гуртковцу трэба паведаміць толькі самую **невялікую колькасьць ведаў і навыкаў, ліквідаваць яго поўную ваенную няпісьменнасьць.**

К канцу зімовых заняткаў удзельнік гуртка павінен атрымаць наступныя навыкі:

На заліковых спаборніцтвах па стральбе, лежачы з рукі, на 25 крокаў з дробнакаліберной вінтоўкі і на 10 крокаў—драбінкай па мішэні № 6 даць ня менш 16-ці ачкоў з 5-ці выстралаў.

Разам з гэтым трэба ведаць зборку, чыстку, змазку і правілы дагляду зброі.

Умець азначаць адлегласьць на вока 600 крокаў з дакладнасьцю да 10 проц.

Ведаць **агульныя абавязкі** адзіночнага байца і ўмець практычна іх ажыцьцяўляць. У прыватнасьці, хутка і правільна выбіраць месца для стральбы, нагляданьня і прыкрыцьця, умець маскіравацца пры дапамозе падручных матар'ялаў, умець хутка і добра акапацца.

Умець орыентавацца па компасе, сонцы і зорках і чытаць найпростшы плян.

Умець наглядаць і весьці агонь у процівазе. Умець падаць першую санітарную дапамогу атручанаму газам, а таксама зрабіць сабе і суседу першапачатковую перавязку.

Ведаць найпростшыя спосабы барацьбы з тэхнічнымі сродкамі ворага.

І акрамя таго

быць у курсе міжнароднага становішча СССР, разумець чарговыя задачы Чырвонай арміі і падрыхтоўкі ўсёй краіны да абароны.

У праграме вызначаны толькі асноўны **абавязковы** касьцяк працы. У залежнасьці ад інтарэсу і падрыхтоўкі слухачоў праграма можа зьмяняцца.

Некаторыя з заняткаў могуць быць прапрацаваны ў значна большай абыйме, калі ў слухачоў зьявіцца цікавасьць да якога-небудзь пытаньня. У зімовы час трэба організаваць заняткі і на адкрытым паветры.

Б. Прастасінскі.

Менскія авіяхімаўцы.

Менскія авіяхім-каманды покуль што яшчэ ня зусім разьвілі сваю працу. Ня вызначаны яшчэ склад камандзіраў і кіраўнікоў. Але тое, што ёсьць, дае ўражаньне праробленай працы.

Мэта авіяхім-каманды, калі можна так сказаць,—чыста „хэмічная". Авіяхім-каманды знаходзяцца пры мясцовых саветах ТСА-авіяхіму. Іх дзяленьне на сэкцыі і кіраўніцтва ТСА-авіяхімам павінна ўжо ставіць «хэмічную» мэту.

Каманды нясуць чатыры службы.

Першае—вывучэньне хэміі і адсюль вывучэньне ўжо атрутных газаў. Гэта мэта адной сэкцыі. Другая сэкцыя—першай дапамогі. Трэцяя—нагляду за паветрам, за аэропланамі ворага. Гэта сэкцыя пад абязна вывучае і лётную справу.

Чацьвертая самая цікавая ў нашых умовах. Яе мэта—нагляд за парадкам у грамадзкіх месцах і дапамога ў тушэньні пажараў.

На некаторых прадпрыемствах Менску, авіяхім-каманды цалкам,і асабліва **чацьвертая сэкцыя, прымалі ўдзел у тушэньні пажараў.**

Побач з пажарнай камандай заводзкай, прыбеглі і „авіяхімаўцы".

Калі хто памятае манэўры гарнізону Менскай акругі, дык той павінен ведаць, што лепшая адзнака камандуючых была аб батальёне ТСА-авіяхіму.

Хто складаў батальён.

Батальён цалкам быў складзены з авіяхім-каманд пры фабрыках і заводах, і часткова з курсаў Дому Чырвонай Арміі.

Значыць, удзел у манэўрах, праца ў сябе на вытворчасьці, падтрыманьне парадку і тушэньне пажараў—гавораць за жыцьцёвасьць гэтых каманд.

Яны карыстаюцца посьпехам на менскіх фабрыках, часткова ў мястэчках і вёсках.

Няма сродкаў.

Чым-жа растлумачыць ўсёж-такі іх малую колькасьць.

У першую чаргу тым, што няма аніякага матар'яльнага базысу.

Пахадзеце па заўкомах, пагутарце з сябрамі каманд. Вось што яны вам адкажуць:

— Прыдзем у заўком за сродкамі, дык яны пасылаюць ў савет Авіяхіму, а савет Авіяхіму таксама ня мае грошай. Так з аднаго месца ў другое і ходзім, а сродкаў няма.

У адносінах матар'яльнай базы каманды на становішчы бяспрытульных. Гэта трэба высьветліць і палажыць канец такому становішчу раз на заўсёды.

Другі недахоп каманд, гэта іх абмяжованасьць. Аб іх мала чуваць, працу не адразу ўбачыш.

І апошняе—гэта аб малай колькасьці дзяўчат. У камандах ёсьць сэкцыя хуткай дапамогі. У іх амаль што няма дзяўчат.

Скарыстайце, хлопцы, вопыт гомельшчыны. Пастаўце працу з „агеньком", з цікавасьцю. І прыдуць людзі. Пачнуць расьці каманды.

Мне думаецца, што для большай праца здольнасьці ў іх працы трэба авіа-каманды зьліць з дружынамі. Мэты-ж адны. У працы толькі некаторая рознавыглядласьць.

Гаворачы аб вопыце каманд аб іх працы трэба ўсё-ж пажадаць ім большага росквіту.

Ал. К.

„Чырвоная Зьмена" дапамагла.

„Выхавацель" Лавыш зьняты з працы.

Бабруйская акруговая прокуратура зрабіла расьсьледваньне фактаў, аб якіх пісалася ў фэльетоне Віцебскага „Дзелавод Лавыш перавыхоўвае" („Чырвоная Зьмена" № 99 ад 6-га верасьня г. г.).

Зробленае расьсьледваньне падцьвердзіла ўсе факты, азначаныя ў фэльетоне. У адміністрацыйным парадку дзелавод Беларускага Інстытуту Соцыяльнага Перавыхаваньня гр. Лавыш зьняты з працы. У часе расьсьледваньня таксама выявілася, што Лавыш зьяўляецца былым служачым паліцыі і пазбаўлены права голасу.

Лавыш выключаны з сябраў профсаюзу асьветнікаў.

Раўняйцеся па курсантах!

Заслухаўшы даклад - інформацыю тав. ВАРОНЧАКА аб падпісцы на «Чырвоную Зьмену», сход курсантаў акруговых курсаў пропагандыстых Аршаншчыны пастанаўляе:

1. Выпісаць усім газэту „Чырвоную Зьмену" па аднаму экз. на Кастрычнік.

2. Абавязаць кожнага курсанта завербаваць на наступныя м-цы 5 дапісчыкаў па іх ячэйках і выклікаць зрабіць гэтак і астатнія акругі

Па даручэньні сходу курсантаў

Паштовая скрынка.

Сідаруку, Цёмкіну і Трутко: Вашы допісы да дзесяцігодзьдзя Кастрычнікавай рэволюцыі не пашлі таму, што позна атрыманы.

С. Андрэю: «Нашы дасягненьні за 10 год» —ня пойдзе. Аб гэтым пісалася ў юбілейным нумары нашай газэты.

Цопалю: Допіс „Вырас новы завод" нельга скарыстаць з-за таго, што неразборчыва напісаны.

Двэрсону „Ячэйка мацнее"—ня пойдзе. Трэба пісаць больш конкрэтна. Уважлівей чытай нашы кіруючыя лісты,

Звычайнаму і Восіпаву: Допісы „Апёкся" і „Паднімаем вытворчасьць працы", дашлеце ў сваю насьценгазэту. Да „Чырвонай Зьмены" яны не падыходзяць, бо гаворыцца ў іх аб такіх дробязях, якія нашага чытача ня могуць зацікавіць.

Адказы чытачам.

С. (№ 1251) Калі комсамолец хворы праншамі, гэта ня значыць, што яго трэба выключыць з комсамолу. Трэба толькі дабіцца, каб ён пачаў лячыцца.

Гузаву (№ 1252). Пасылку на працу бронь-падросткаў утварае юнсэкцыя пры Біржы Працы.

Крукаву (№ 1253), Сяброўскія ўзносы павінны плаціцца са дню зацьвярджэньня ў КСМ агульным сходам ячэйкі.

Шашкову (1254). Аўтомобільнага тэхнікуму ў БССР няма.

Майміну (№ 1255). Хлапец, бацька якога пазбаўлены права голасу, можа быць сябрам профсаюзу, калі ня мае ніякіх адносін да сям'і.

Сьмідаву (№ 1256). Месца ў рабфак для сваіх юнкораў „Чырвоная Зьмена ня мае.

Абвестка.

Горрайком ЛКСМБ паведамляе, што ў чацьвер, 1-га сьнежня, адбудзецца нарада ўпаўнаважаных па друку ў памяшканьні райкому. Яўка абавязкова.

Адказныя рэдактары: А. БАРАНЬНІКАЎ. А. КУРЦІК.

Галоўлітбел № 24867.

1-ая дзяржаўная друкарня.